# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МОЛАДЗІ СРОДКАМІ РОДНАЙ МОВЫ

*Комлева В.П.*
*Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Цэнтр творчасці “Эверэст” г.Магілева», г.Магілеў*

Кароткая анатацыя: прадстаўлены на форум матэрыял уяўляе сабой практычную дзейнасць, накіраваную на патрыятычнае выхаванне моладзі сродкамі роднай мовы, стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнцаў, выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі праз правядзенне традзіцыйнага адкрытага конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці «На пачатку дарог». Асаблівасць правядзенні  конкурсу заключаецца ва ўзаемадзеянні з іншымі структурамі: аддзелам ідэалагічнай работы і па справах моладзі, «Магілёўскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Куляшова», установы культуры «Музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі» Філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, «Центральная гарадская бібліятэка ім. К.Маркса УК «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Магілева».

Ключавыя словы: патрыятызм, сродкі роднай мовы, конкурс «На пачатку дарог».

Нікога не трэба запэўніваць у тым, што ў сучасных умовах грамадзянскае патрыятычнае выхаванне з’яўляецца адной з галоўнейшых задач, якія стаяць перад грамадствам. Толькі чалавек, які валодае лепшымі агульначалавечымі якасцямі, які адчувае прыналежнасць да свайго роду, сям’і, да сваёй Радзімы, дзяржавы і грамадства, ўсяго, што адбываецца навокал, які адчувае цікавасць і павагу да гістарычнай і культурнай спадчыны, роднай мовы, можа лічыцца сапраўдным грамадзянінам і патрыётам.

Станаўленню асобы дзіцяці, здольнай у будучым заняць дастойнае месца ў жыцці грамадства, неабходна педагагічная падтрымка. Вялікія магчымасці для развіцця важных маральных якасцяў асобы, яе каштоўнасных арыентацый і духоўных запатрабаванняў мае сістэма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Гаворачы пра выхаванне патрыятызму, трэба памятаць, што патрыёта можна выхоўваць толькі ў працэсе актыўнай творчай дзейнасці.

Менавіта таму ў дзяржаўнай ўстанове дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці “Эверэст” г. Магілёва” адным з метадаў патрыятычнага выхавання моладзі абраны метад выкарыстання сродкаў сучаснай беларускай мовы праз правядзенне традзіцыйнага адкрытага конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці «На пачатку дарог» (далее- Конкурс).

Конкурс праводзіцца з 2020 года і  прысвечваецца юбілейным датам народным пісьменнікам Беларусі: 100-годдзю з дня нараджэння І.Шамякіна, 90-годдзю – У.Караткевіча, 140-годдзю – Я. Купалы і Я. Коласа, 110-годдзю – А.Куляшова. У 2024 годзе конкурс прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння В.Быкава.

Мэтамі конкурсу з’яўляецца:

патрыятычнае выхаванне моладзі сродкамі роднай мовы;

папулярызацыі творчасці народных пісьменнікау Беларусі;

стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнцаў, выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі.

Удзел ў Конкурсе прымаюць навучэнцы ўстаноў адукацыі і культуры горада Магілева ва ўзросце ад 6 да 31 года ўключна.

Штогод Конкурс пашырае свае межы. Партнерамі з’яуляюцца аддзел ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне культуры Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне па адукацыі Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта, Ленінская і Кастрычніцкая раённыя арганізацыі горада Магілёва РГА «Белая Русь», «Магілёўскае абласное аддзяленне грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», установа адукацыі  «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова», установа культуры «Музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі» Філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, «Центральная гарадская

бібліятэка ім. К.Маркса УК «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Магілева».

Конкурс праводзіцца у некалькіх намінацыях.

У намінацыі «Мастацкае слова» (індывідуальнае і калектыўнае выкананне) удзельнікі прадстаўляюць уласнае выкананне вершаў, урыўкаў з апавяданняў пісьменніка, якому прысвечаны конкурс.

Культура чытання твораў з’яўляецца паказчыкам культурнага развіцця чалавека, жыццёва неабходным уменнем, а таксама спосабам вывучэння роднага слова, якое дапамагае выклікаць зацікаўленнасць і эмацыянальнасць у дзяцей і юнакоў. Завучванне на памяць спрыяе павышэнню агульнага інтэлектуальнага развіцця чалавека, служыць выхаванню волі, цярплівасці, настойлівасці. Выразнае чытанне твора на памяць магчыма толькі тады, калі ён добра асэнсаваны, а значыць з’яўляецца магчымасць да захавання і перадачы культурна-гістарычнага вопыту беларускага народа паміж пакаленнямі. Літаратурныя творы з’яўляюцца ўзорамі чалавечых пачуццяў, крыніцай пазнання дабра і зла, нацыянальнай годнасці і высокай маральнай вартасці чалавека.

На прыкладзе твораў мастацтва ў дзяцей і моладзі абуджаюцца не толькі эстэтычныя пачуцці, але і выклікаецца матывацыя да ўласнай творчасці. Менавіта таму ў Конкурсе узнікла намінацыя «Уласная паэзія», у якой удзельнікі прадстаўляюць творы ўласнага сачынення грамадзянскай патрыятычнай тэматыцы.

Удзельнікі дэманструюць яскравыя творчыя здольнасці. Гэта намінацыя прадстаўляе магчымасць для самарэалізацыі творчага патэнцыялу. Лепшыя творы узнагароджваюцца правам быць надрукаванымі ў газеце «Вестнік Магілева», што з’яўляецца асаблівай паддтрымкай для таленавітых дзяцей і моладзі.

Яшчэ адна з яскравых намінацый – «Тэатральная пастаноўка», у якой удзельнікі прадстаўляюць невялікую пастаноўку па творчасці пісьменнікаў, якім прысвечваецца конкурс. Акцёрскія навыкі – гэта магчымасць самарэалізацыі ў выступленнях на публіцы. Пад час выступаў у якасці артыстаў дзеці і моладзь атрымоўваюць сацыяльную адаптаванасць. Каштоўнасць тэатральнай дзейнасці яшчэ і ў тым, што яна дапамагае моладзі зрокава ўбачыць змест літаратурнага твора, развівае ўяўленне, без якога не магчыма цэласнае ўспрыманне мастацкай літаратуры, культурнай спадчыны.

Намінацыя «Малюнкі» ўключае адлюстраванне твораў беларускіх пісьменнікаў праз малюнкі юных мастакоў. Тут есць магчымасць яшчэ больш развіць пачуццё патрыятызму і павагі да беларускай дзяржаўнасці, усвядоміць неабходнасць беражлівых адносін да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый свайго народа і, вядома ж, праявіць уласныя таленты.

Асаблівасць гэтай намінацыі яшчэ і ў тым, што па вынікам завочнага этапа пераможцы змагаюцца за званне «Гран-пры». На базе ўстановы культуры «Музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі» Філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь» у прысутнасці членаў журы ўдзельнікі малююць работы на зададзеную тэматыку.

Адным з эфектыўных метадычных сродкаў, які дазваляе перадаць думку так, каб яна закранула іншых, з’яўляецца буктрэйлер. Гэта адзін з лепшых спосабаў зацікавіць, асабліва моладзь, бо ў сучасным грамадстве вядучая роля належыць інфармацыйным рэсурсам. У намінацыі «Буктрэйлер» удзельнікі прадстаўляюць свой уласны ролік працягласцю да 3 хвілін, які адлюстроўвае прэзентацыю літаратурнага матэрыяла па творчасці народных пісьменнікаў Беларусі. Буктрэйлеры ўдзельнікаў маюць свой арыгінальны сюжэт і аўтарскае бачанне, музычнае суправаджэнне або агучванне.

Па вынікам Конкурсу адбываюцца ўрачыстыя цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў.

Ва ўсе часы моладзь несла і нясе асаблівую адказнасць за зберажэнне і прадаўжэнне традыцый грамадства, за пераемнасць гісторыі і культуры, будучыню сваёй краіны. Выхаванне маладога пакалення – задача складаная, і адным з самых важных напраўленняў яе ажыццўлення з’яўляецца абуджэнне інтарэсу да роднай мовы, культуры і гісторыі.

Конкурс “На пачатку дарог” – гэта яскравы прыклад такога выхавання.

З вопыту правядзення Конкурсу можна адзначыць, что магчымасць прадэманстраваць навыкі мастацкага слова і акцёрскага майстэрства, унікальнасць уласнай паэзіі, прыгажосць малюнкаў і стварэнне відэаролікаў не пакідаюць абыякавымі маладыя таленты.

Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Працэс пазнання літаратуры як мастацтва арганічна звязаны з працэсам фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый, адносін да жыцця, да людзей.

У час працы з тэкстамі беларускіх народных пісьменнікаў молодзь далучаецца да гісторыі, духоўнай культуры свайго народа, яго традыцый і здабыткаў. Атаясамліваючы сябе з гэтай культурай, у іх фарміруецца свой светапогляд, выхоўваецца нацыянальная самасвядомасць і фарміруецца гонар за дасягненне сваей краіны.

Літаратура:

1. Кубракова, Н. Прыёмы фарміравання навыку чытання ў вусным курсе навучання беларускай мове / Н. Кубракова // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лігвадыдактыкі: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай, Брэст, 20-21 сакавіка 2008 г. / Пад агул. рэд. М.І. Новік; рэдкал.: М.І. Новік, В.М. Касцючык, Л.І. Яўдошына, С.Ф. Бут-Гусаім; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Каф. беларускага мовазнаўства. — Брэст: БрДУ, 2008. — 324 с.
2. Кулагіна, П.А. Пошук як умова творчасці / П.А. Кулагіна // Вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў школе: Кніга для настаўніка: зб. артыкулаў / Пад рэд. М.А. Лазарука. — Мінск: Народная асвета, 1988. — С.123-126.
3. Рыхлова, В.А. Узростава-псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання твораў беларускай мастацкай літаратуры падлеткамі / В.А. Рыхлова // Акадэмік М.А.Лазарук і праблемы літаратурнай адукацыі Беларусі: Матэрыялы рэспубліканскіх мемарыяльных навуковых чытанняў і навукова-педагагічнай і літаратуразнаўчай спадчыны акадэміка М.А. Лазарука, Мінск, 4 кастрычніка 2001. / А.І. Бельскі. — Мінск: НІА, 2003. — 296 с.